Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

1 снежня 2015 года, № 20 (2144)

АКТУАЛЬНА

Платныя пераздачы – дадатковы стымул студэнтам для падрыхтоўкі да сесіі

Тэма ўвядзення платных пераздач стала надзвычай актуальнай. З гэтай нагоды са зваротам да ўніверсітэцкай супольнасці звярнуўся рэктар БДУ **Сяргей Абламейка**

Паважаныя студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі БДУ!

У апошні час у публікацыях на некаторых інфармацыйных рэсурсах з'явілася недакладная і правакацыйная інфармацыя аб Беларускім дзяржаўным універсітэце.

БДУ заўсёды паважліва ставіцца да меркавання сваіх студэнтаў па абсалютна ўсіх пытаннях жыцця і дзейнасці ўніверсітэта, прыцягваючы да вырашэння важных пытанняў універсітэцкага жыцця развітую сістэму органаў студэнцкага самакіравання.

Інтарэсы студэнтаў БДУ прадстаўляюць такія грамадскія аб'яднанні і органы студэнцкага самакіравання, як пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ, студэнцкі саюз, студэнцкі савет па якасці адукацыі, савет старастаў, пярвічная арганізацыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі БДУ, органы студэнцкага самакіравання студэнцкага гарадка, што цалкам адпавядае прынцыпам Балонскага працэсу.

Універсітэт заўсёды імкнецца ствараць умовы для актыўнага дыялогу са студэнтамі. Любы студэнт і супрацоўнік можа звярнуцца да рэктара БДУ ва ўстаноўленым парадку, у тым ліку і з дапамогай электроннага звароту, запісацца на прыём. Акрамя гэтага, рэктар і прарэктары БДУ рэгулярна сустракаюцца ў розных фарматах са студэнтамі для абмеркавання бягучых пытанняў.

Нас хвалюе якасць адукацыі і прэстыж дыплома БДУ. Клапоцячыся пра гэта, БДУ ўвёў плату за пераздачу залікаў і экзаменаў, што з'яўляецца адным з інструментаў уплыву на вучобу студэнтаў. Акрамя гэтага, выкарыстоўваецца і шэраг іншых захадаў па паляпшэнні якасці адукацыйнага працэсу. Звяртаем увагу, што БДУ не ўводзіць плату за адпрацоўку прапушчаных заняткаў, лабараторных работ, як гэта падаецца ў некаторых інфармацыйных паведамленнях.

Рашэнне аб увядзенні платы за пераздачу залікаў і экзаменаў прынята пасля папярэдняга абмеркавання з усімі навучальнымі падраздзяленнямі ўніверсітэта, адбыліся сустрэчы кіраўніцтва з органамі студэнцкага самакіравання; студэнцкім саветам па якасці адукацыі праведзена апытанне думкі студэнтаў. Была таксама праведзена сустрэча моладзевых лідараў БДУ са студэнтамі, дзе ахвотныя змаглі задаць пытанні, якія іх цікавяць, і атрымаць на іх адказы. Рэктарат БДУ атрымаў калектыўны зварот студэнтаў па пытанні аб плаце за пераздачы і адказаў на яго. Пасля падачы звароту ніхто са студэнтаў па гэтым пытанні на прыём да рэктара або прарэктараў не прыходзіў.

Інфармацыя аб тым, што адбываўся «ціск» на студэнтаў БДУ, якая распаўсюджваецца некаторымі інфармацыйнымі рэсурсамі і незарэгістраванымі арганізацыямі, не адпавядае рэчаіснасці. У нас няма ні аднаго факта, каб студэнтаў універсітэта хтосьці праследаваў за якія-небудзь дзеянні. Канкрэтныя факты аб кожным падобным выпадку стануць прадметам разгляду на ўзроўні кіраўніцтва ўніверсітэта.

БДУ абураны спробамі некаторых арганізацый перавесці абмеркаванне пытання аб увядзенні платы за пераздачу залікаў і экзаменаў з выключна адукацыйнай і прававой у палітычную плоскасць. Лічым непрымальнымі спробы ўцягнуць студэнтаў нашага ўніверсітэта і іншых універсітэтаў краіны ў дэструктыўныя працэсы, закліканыя раскалоць акадэмічную супольнасць, скампраметаваць сістэму вышэйшай адукацыі краіны.

Заклікаю ўсю ўніверсітэцкую супольнасць не даць уцягнуць нас у правакацыйныя дзеянні трэціх сіл! Студэнты, будзьце пільнымі! Вас могуць уцягнуць у «палітычныя гульні» без вашага жадання. Наступствы такіх «гульняў» не заўсёды прадказальныя.

Заклікаю вас захоўваць прыхільнасць акадэмічным ідэалам і каштоўнасцям, добрасумленна вучыцца і вучыць, займацца навуковай дзейнасцю, працаваць і ствараць на карысць роднага ўніверсітэта і краіны!

Рэктар БДУ
акадэмік С. У. АБЛАМЕЙКА

Студэнцкая асамблея БДУ: «Платныя пераздачы паспрыяюць павышэнню адказнасці студэнтаў»

Лідары моладзевых арганізацый 19 лістапада абмеркавалі са студэнтамі слушнае палажэнне аб аплаце паўторнай здачы экзаменаў і залікаў, якое было нядаўна зацверджана рэктарам.

Да дыскусіі далучыліся лідары студэнцкіх арганізацый БДУ: старшыня студсаюза **Уладзіслаў Бунас,** старшыня прафкама **Вольга Локцева,** старшыня савета па якасці адукацыі **Павел Лабацэвіч,** старшыня каардынацыйнага савета студэнцкіх інтэрнатаў **Вераніка Луд,** старшыня савета старастаў **Ксенія Валністая.** Сакратар БРСМ і старшыня Студэнцкай асамблеі БДУ **Яўген Харук** у адказ на пытанне пералічыў, што менавіта будуць пераздаваць студэнты платна.

– Уся інфармацыя пра кошт дадатковых адукацыйных паслуг размешчана на сайце БДУ ва ўкладцы «Платныя паслугі». Спіс вычарпальны. Палажэнне не прадугледжвае плату за адпрацоўкі лекцый, семінараў, лабараторных і пропускі заняткаў.

Што турбавала студэнтаў?

Студэнтаў, што прыйшлі на сустрэчу, цікавілі дзеянні і меркаванне студэнцкіх арганізацый БДУ. «Студэнцкая асамблея таксама за ўвядзенне. Не таму, што мы падтрымліваем адназначна адміністрацыю ва ўсім, што нам сказалі. А таму, што мы сапраўды кожны ў сваёй арганізацыі правялі працу, даведаліся пра меркаванні», – рэзюмаваў Яўген Харук.

На пытанне пра прычыны ўвядзення платных пераздач старшыня студэнцкага савета па якасці адукацыі БДУ Павел Лабацэвіч адказаў:

– Пераздачы ўводзяцца дзеля таго, каб павялічыць адказнасць студэнтаў за навучанне. Былі адны патрабаванні. Высветлілася, што студэнты на іх слаба рэагуюць. Цяпер патрабаванні зрабілі больш жорсткімі. Усё празрыста. Калі чалавек трапляе ва ўніверсітэт, ён робіцца дарослым. Я не магу сказаць, у якой ступені, але лічу, што платныя пераздачы пасадзейнічаюць павышэнню адказнасці студэнтаў.

Што мы маем у выніку?

1. Платна ліквідаваць акадэмічную запазычанасць і акадэмічную розніцу навучэнцы пачнуць з новага года.

2. Плаціць будуць студэнты дзённай формы адукацыі і завочнай, платнікі і бюджэтнікі. Пра гэта падчас сустрэчы казала старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Вольга Локцева: «Вы, хутчэй за ўсё, ведаеце, што ў базавы кошт атрымання адукацыі ўваходзіць толькі аднакратная здача і абарона. І калі ўзнікае акадэмічная запазычанасць, то на падставе заканадаўства атрымліваецца так, што гэта ўжо адукацыйная паслуга. І такую адукацыйную паслугу павінны аказваць пры ўмовах фінансавага пакрыцця».

3. Пра платную адпрацоўку лекцыйных, практычных, лабараторных і іншых заняткаў гаворка не ідзе.

4. Экзамен, дыферэнцыраваны залік можна пераздаць не болей за два разы; практыку, абарону курсавога праекта, кандыдацкі экзамен/залік – не болей за адзін раз. Зноў здаць дзяржаўны экзамен, абараніць дыпломны праект і магістарскую дысертацыю можна не раней чым праз 10 месяцаў пасля фіяска, але не пазней чым праз тры гады пасля заканчэння навучання.

Віталь АРЭШКА
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У ДАДАТАК

Па словах начальніка ГУВНМР **Людмілы ХУХЛЫНДЗІНАЙ,** па выніках зімовай сесіі 2014/2015 нав. г. у сярэднім па ўніверсітэце мелі запазычанасці па выніках экзаменаў 21,1 % студэнтаў дзённай формы навучання. Гэта **2790 чалавек,** з іх:

– 1867 студэнтаў з адной нездавальняючай адзнакай;

– 712 студэнтаў з дзвюма нездавальняючымі адзнакамі;

– 211 студэнтаў з трыма нездавальняючымі адзнакамі (дадзеныя асобы адлічаны з універсітэта).

Прычым за апошнія гады абсалютная паспяховасць студэнтаў паступова падае. Так, у 2007/2008 навуч. г. яна складала 82,7 %; у 2008/2009 навуч. г. – 81,6 %, у 2012/2013 навуч. г. – 80,3 %. У зімовую сесію 2014/2015 нав. г. паспяховасць знізілася да 78,9 %, што прывяло да 2790 пераздач! Прычым, падкрэсліваецца, тут прыведзена статыстыка толькі па выніках здачы экзаменаў навучэнцамі дзённай формы атрымання адукацыі. Яшчэ раз адзначым, што сістэма ліквідацыі акадэмічных запазычанасцяў на платнай аснове ўведзена як дадатковая мера стымулявання паспяховасці і ніяк не звязаная з заробкам выкладчыкаў і, адпаведна, з нібыта планавымі паказчыкамі па колькасці такіх пераздач.

АСОБЫ

Летапісец айчыннай журналістыкі

30 кастрычніка прафесар кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ доктар гістарычных навук Алег СЛУКА быў ушанаваны дыпломам лаўрэата конкурсу імя У. І. Пічэты за працу «Фундаментальнае даследаванне працэсу нацыянальнай камунікацыі» і серыю навуковай літаратуры пад агульнай назвай «Беларуская журналістыка».

Справай усяго жыцця прафесара Алега Слукі стала вывучэнне шматбаковай, шматгранай дзейнасці айчынных масмедыя і найлепшых твораў нацыянальнай публіцыстыкі.

Падзеі часоў перабудовы, імклівая дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця другой паловы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. прывялі да кардынальных змен у беларускіх сродках масавай інфармацыі. Алег Слука адным з першых адгукнуўся на выклікі часу, распачаўшы працу над падручнікам новага пакалення, дзе б знайшлі больш грунтоўнае асэнсаванне гісторыі беларускай журналістыкі, якая вядзе свой адлік з 1563 г., ад часу выхаду ў Вялікім Княстве Літоўскім газеты-аднадзёнкі «Новіны грозные а жалостлівые...».

У 1993 г. прафесар Алег Слука распрацаваў канцэпцыю маштабнай працы па стварэнні **фундаментальнай гісторыі нацыянальнай камунікацыі.** У адрозненне ад савецкай канцэпцыі развіцця беларускага друку, калі пад увагу прымалася толькі рэвалюцыйная плынь, новая канцэпцыя грунтавалася на аналізе аб'ектыўных гістарычных працэсаў. Гэтыя прынцыпы былі пакладзены ў аснову ўсіх трох вучэбных дапаможнікаў «Беларуская журналістыка», якія выйшлі з-пад пяра навукоўца ў пачатку XXI стагоддзя.

Першы вучэбны дапаможнік «Беларуская журналістыка» (2000) ахоплівае працяглы перыяд станаўлення беларускай журналістыкі ў Вялікім Княстве Літоўскім і яе далейшага існавання падчас знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. На мяжы Сярэднявечча і Новага часу на аснове развіцця пісьменнасці адразу ўзнікла рэлігійная, а затым і свецкая публіцыстыка, якая была значным сродкам сацыяльнай сувязі ў грамадстве. Даследчык адзначае важную ролю эпохі Францыска Скарыны ў фарміраванні асноўных рысаў публіцыстыкі гуманізму, ажыццявіўшы рэвалюцыйны паварот у культуры старажытнага беларускага грамадства, у тым ліку і ў сацыяльнай камунікацыі.

У поле зроку навукоўца патрапілі палітычныя, рэлігійныя, грамадскія, афіцыйныя і іншыя беларускія выданні, якія выходзілі з другой паловы XVI да пачатку XX стагоддзя. Пры характарыстыцы асноўных перыядаў развіцця беларускага друку аўтар абапіраўся на аналіз зместу найбольш значных газет, бюлетэняў, часопісаў і альманахаў, якія аказалі велізарны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці. Асновай для стварэння сістэмы беларускага нацыянальнага друку фактычна сталі першыя беларускія легальныя газеты «Наша доля» і «Наша ніва» (рэдактарам апошняй у 1914–1915 гадах быў Янка Купала).

Другая частка падручніка «Беларуская журналістыка» (2003) прысвечана развіццю беларускай савецкай журналістыкі ў 1917–1941 гг. Аўтар з улікам патрабаванняў сённяшняга дня зрабіў сістэмны аналіз дзейнасці вядучых выданняў беларускай плыні ў перыяд станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці, даў разгорнутую карціну станаўлення рабселькараўскага руху і ўдзелу савецкага друку ў будаўніцтве асноў сацыялістычнага грамадства. У кнізе ўпершыню разгледжаны перыядычныя выданні эмігранцкіх суполак беларусаў у блізкім і далёкім замежжы, арганізацыя друку палітычных партый і нацыянальных дэмакратычных арганізацый у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.), абагульнены вопыт дзейнасці беларускага радыё (з 1926 г.) і інфармацыйнай службы БелТА.

У трэцяй частцы падручніка «Беларуская журналістыка» (2009) разглядаецца гісторыя развіцця СМІ ў ваенны і пасляваенны час. Аўтарам праведзены падрабязны аналіз працэсу фарміравання нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, які вядзе адлік ад пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя, пасля абвяшчэння незалежнай беларускай дзяржавы, і працягваецца сёння. Матэрыялы, якія расшукаў даследчык, знаходзіліся не толькі ў фондах айчынных бібліятэк, але і ў кнігасховішчах Санкт-Пецярбурга, Вільнюса, Масквы, Кіева і іншых гарадоў на прасторах СНД.

Праца над трохтомным цыклам падручнікаў па гісторыі беларускай журналістыкі заняла амаль два дзесяцігоддзі. Грунтоўнае даследаванне масавай камунікацыі ў рэчышчы развіцця нацыянальнай гісторыі, упершыню праведзенае ў Беларусі, атрымала высокую ацэнку Беларускага саюза журналістаў, які ў 2011 г. узнагародзіў доктара гістарычных навук Алега Слуку прэміяй «Залатое пяро» імя Рыгора Булацкага, які, дарэчы, з'яўляўся навуковым кіраўніком і кансультантам кандыдацкай і доктарскай дысертацый таленавітага навукоўца.

Падрыхтаваныя і выдадзеныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі сталі асновай для стварэння рэцэнзуемага ***падручніка «Беларуская журналістыка».*** Новае фундаментальнае даследаванне ўбачыла свет у 2011 г. у серыі «Класічнае ўніверсітэцкае выданне». Падручнік з'яўляецца наватарскім з пункта гледжання методыкі сучаснага ўніверсітэцкага навучання. Тэарэтычныя палажэнні дапоўнены характэрнымі прыкладамі з практыкі СМІ, аўтар не толькі аналізуе публіцыстычныя творы, але і разглядае дзейнасць вядучых рэдакцый радыё і тэлебачання, інтэрнэту. «Беларуская журналістыка» – гэта ў пэўнай ступені «скарочаны сусвет» шматстайных інфармацыйных працэсаў з іх магутным уплывам на палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні ў сучасным грамадстве.

Аўтар на старонках падручніка нямала месца адводзіць даследаванню кардынальных змен у працэсе камунікацыі, разважае аб перспектывах дзейнасці нацыянальных СМІ. Суіснаванне на газетна-часопісным рынку афіцыйных і неафіцыйных выданняў, друкаваных органаў палітычных партый і грамадскіх рухаў, зацверджаная Законам аб друку і іншых СМІ магчымасць свабоднага публічнага выказвання грамадзянамі краіны сваіх поглядаў і меркаванняў, паводле цвёрдага пераканання навукоўца, дае ўсе падставы лічыць, што сродкі інфармацыі Беларусі сталі прагрэсіўным інстытутам фарміравання грамадскай думкі.

Пётр ДАРАШЧОНАК,
дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ

НАША СПАДЧЫНА

«Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў»

Да 85-гадовага юбілею з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры прайшоў «адкрыты мікрафон» «Прачытай Караткевіча з намі».

Студэнты падрыхтавалі вершы, урыўкі прозы, песні на словы Уладзіміра Караткевіча.

Пачаўся вечар з верша «На Беларусі Бог жыве» ў выкананні *Святланы Чыжык* і верша «Зімняя элегія» ад *Веранікі Працэнкі.*

Тэму песень на вершы Караткевіча адкрывалі па словах-успамінах дырыжора *Міхаіла Фінберга:* «Уладзімір Караткевіч – сімвал нацыянальнага духу. Калі я прыйшоў у эстраду, то быў здзіўлены, што на яго вершы было напісана ўсяго некалькі песень. У мінулым годзе мы падрыхтавалі канцэртную праграму «Новыя песні Уладзіміра Караткевіча», у якую ўвайшлі 30 твораў. Караткевіча лёгка перакладаць на мову песні. Таму што яго паэзія адлюстроўвае ўнутраны стан беларуса, яго душу і даказвае, што беларуская мова – самая лепшая і мілагучная ў свеце».

Каб пацвердзіць гэтыя словы, студэнтка эканамфака *Ганна Палачанкіна* праспявала акапэла «Устану рана насустрач сонцу».

Наступнай тэмай стала сувязь Уладзіміра Карткевіча і нідэрландскага мастака Іераніма Босха.

«Сапраўдныя паэты, мастакі асабліва востра адчуваюць падзеі, якія адбываюцца, і нават могуць прарочыць будучыню. Пра такога прарока Іераніма Босха напісаў верш Караткевіч», – распавяла вядучы бібліятэкар *Ірына Шкіронак.*

«Караткевіч сам быў прарокам. За 17 гадоў да чарнобыльскай аварыі напісаў верш «Дзяўчына пад дажджом», які расказала *Наталля Юркевіч.*

Патрыятычную тэматыку прадэманстраваў *Аляксандр Духан* песняй «Дзе мой край».

Песню «Казкі» выканала студэнтка філфака *Аліна Карпіцкая.*

«Ёсць у Аліны сябар *Аляксандр Радзівонаў,* якога дзяўчына ўгаварыла паўдзельнічаць у мерапрыемстве. Аляксандр падумаў-падумаў і выбраў свой любімы верш Уладзіміра Караткевіча. А таксама, наколькі я ведаю, і аднаго з членаў журы Анатоля Вераб'я – «Заяц варыць піва».

Працягнуў вечар урыўкам з апавядання «Лятучы галандзец» студэнт гістфака *Іван Цвірка.*

Творы Караткевіча перакладзены больш чым на дваццаць моў.

Прадэкламаваў верш «Лісце» на персідскай мове студэнт ФФСН *Дзмітрый Корзунаў.*

Наступным быў дуэт *Аліны Карпіцкай і Святланы Чыжык* «Цягнікі заспявалі, заплакалі...».

«...Караткевіч зведаў горкага кахання. Але мы не будзем пра сумнае. Сёння ў нас жартоўны верш «Гісторыя з першым каханнем у выкананні студэнта гістфака *Кастуся Цаўлоўскага*».

Наступнай вялікай тэмай чытанняў стала вучоба аўтара на рускім аддзяленні філалагічнага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі.

Менавіта верш Шаўчэнкі «Сон» расказаў сын украінскага народа *Сяргей Шэўчык.*

Яшчэ адной вялікай тэмай на мерапрыемстве была славутая аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха».

Песню на словы і музыку Сяргея Башлыкевіча пра дзікае паляванне выканала *Ксенія Валенда*, а сябры літаратурнай суполкі «КЛУмБа» інсцэніравалі ўрывак з аповесці.

Пад уплывам твораў класіка напісала свой верш студэнтка філфака *Кацярына Роўда* пад назвай «Жыве Караткевіч».

Было некалькі віктарын пра жыццё і творчасць Караткевіча. Адну правёў студэнт-гісторык *Андрэй Кімбар,* а другую літаратуразнаўца, кіраўнік праекта 25-томнага выдання У. Караткевіча, дацэнт БДУ *Анатоль Верабей.*

«У дзень нараджэння Роберта Бёрнса шатландцы віншуюць адзін аднаго са святам. Я вас усіх сёння таксама віншую. Хачу адкрыць таямніцу: ёсць малюнак Караткевіча, які яшчэ не друкаваўся. Там ёсць Шэкспір, Пушкін і Караткевіч. Караткевіч, па сутнасці, выканаў гістарычную місію ў беларускай літаратуры. Ён пайшоў далей за Конан Дойла і зрабіў першы беларускі гістарычны раман-дэтэктыў», – зазначыў Анатоль Верабей.

Мерапрыемства ладзілася пры падтрымцы фундаментальнай бібліятэкі, саюза жанчын і клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа».

Фаіна НАКАНЕЧНАЯ

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Мы выбіраем Беларусь!

У Міжнародны дзень студэнта па ініцыятыве саюза жанчын БДУ адбыўся круглы стол «Я выбіраю Беларусь!» з удзелам замежных студэнтаў, выкладчыкаў са Славакіі і Польшчы, якія зараз працуюць на філалагічным факультэце, Веры Немчакавай і Магдалены Мендрак, а таксама кіраўніка Інфацэнтра японскай культуры Тацумі Масака. Гэта быў першы крок новага праекта «Жанчыны свету супраць вайны і агрэсіі».

На сучасным этапе грамадскага развіцця ўсё больш увагі надаецца асабістаму ўнутранаму свету чалавека і павялічваецца роля асабістага пачатку ў барацьбе за лепшыя ідэалы чалавецтва. Тэма міру – адна з самых шырокіх і ўсеабдымных грамадскіх тэм, і яна не можа пакінуць абыякавымі ўсіх людзей свету. У апошнія гады больш выразна сталі бачыцца і выяўляцца асабістыя інтарэсы канкрэтнага чалавека ў справе абароны міру.

Удзельнікі мерапрыемства адзначалі, што Беларусь сёння з'яўляецца ўнікальным месцам міру і бяспекі для прадстаўнікоў любой нацыянальнасці. Дабрыня, гасціннасць, спагадлівасць, прыстойнасць, талерантнасць беларусаў застаюцца нязменнымі. Студэнты сцвярджалі, што ідэя міру залежыць ад усіх людзей, ад інтарэсаў кожнага індывіда – бо ён часцінка чалавецтва. У вуснах студэнтаў гэта ідэя гучала надзвычай хвалююча, бо яна выказвалася ад імя маладых людзей, за якімі будучыня.

Яны адзначылі высокую якасць адукацыі ў галоўным універсітэце краіны, прафесіяналізм і добразычлівасць выкладчыкаў. Гаварылася і пра тое, што менавіта праз адукацыйныя і культурныя кантакты, вывучэнне замежных моў і знаёмства з нацыянальнымі культурамі ляжыць шлях да ўзаемапаразумення, сяброўства паміж народамі, міру на ўсёй Зямлі.

Старшыня саюза жанчын БДУ Ірына Казакова акцэнтавала ўвагу на важнай ролі жанчын у захаванні міру ва ўсім свеце, асабліва падкрэсліла высокую адказнасць жанчыны – маці і выкладчыка вышэйшай школы, якая навучае і выхоўвае не толькі сваіх дзяцей, але і маладое пакаленне, студэнтаў з розных краін свету, прадстаўнікоў розных культур і светапоглядаў.

Таццяна БЕЛЬСКАЯ

НАШЫ ГОСЦІ

Лекар грамадства

Вядомы сацыёлаг член-карэспандэнт РАН Жан Тошчанка выступіў 26 лістапада на факультэце філасофіі і сацыяльных навук з лекцыяй па тэме «Актуальныя праблемы грамадства ў свеце сацыяльных трансфармацый».

Жан Тошчанка з'яўляецца доктарам філасофскіх навук, загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі сацыялогіі, дэканам сацыялагічнага факультэта РДГУ. Акрамя гэтага, ён вось ужо 20 гадоў галоўны рэдактар часопіса «Сацыялагічныя даследаванні».

На лекцыі абмяркоўвалі ролю і месца, новыя аб'екты даследавання, выдаткі развіцця і многае іншае ў сучаснай сацыялогіі. Прафесар адзначыў для студэнтаў галоўную ролю грамадазнаўца – аператыўна адгукацца на якасныя змены працэсаў, якія адбываюцца ў свеце. А таксама даў сваё азначэнне паняццю «сацыёлаг».

– Часта пытаюцца, які б я выбраў тэрмін для абазначэння дадзенай прафесіі. Для мяне гэта сацыяльны лекар, які робіць дыягностыку сучаснасці. Той, хто даследуе штодзённасць: чым чалавек жыве і што яго хвалюе, якія мае планы. Такім чынам, мы можам адказаць і на патрэбы навукі, і на патрэбы практыкі.

Жан Цярэнцьевіч прапанаваў сваю трактоўку прадмета сацыялогіі. Справа ў тым, што многія даследчыкі лічаць вывучэнне грамадства сутнасцю навукі.

– Але яго вывучаюць філосафы, палітолагі, культуролагі, псіхолагі... На мой погляд, прадметам павінна з'яўляцца грамадская свядомасць. Што чалавек ведае, яго інтарэсы і матывы, як ён гэта рэалізуе і ў якім асяродку, – разважае навуковец.

Горача абмяркоўвалася змена месца сацыялогіі ў жыцці грамадства. Так, сёння амаль усе кіраўнічыя органы маюць свае сацыялагічныя службы, СМІ даволі актыўна выкарыстоўваюць сацыялагічныя дакументы, а сама інфармацыя часам становіцца зброяй палітычнай альбо іншай барацьбы.

Падчас лекцыі таксама абдумвалі тэндэнцыі ў галіне метадалогіі і методыкі, спрэчныя праблемы сённяшняй сацыялогіі, новыя тэорыі і канцэпцыі. Асаблівую ўвагу Жан Тошчанка надаў гістарызацыі.

– Прытрымліваюся думкі, што патрэбна заўсёды ведаць гісторыю і яе папярэднікаў. Мінулае дапамагае растлумачыць і ўдакладніць некаторыя сучасныя пытанні самой сацыялогіі. І, вядома, гэта дае больш магчымасцяў сацыёлагам у працы.

Аўдыторыя ахвотна разбіралася ў крытычных функцыях сацыялогіі, разглядала крытыку талерантнасці, глабалізацыі. Не абмінулі ўвагай новыя аб'екты даследавання ў эканамічнай і палітычнай сацыялогіі, у сацыяльным і духоўным жыцці.

Падводзячы вынікі, выкладчык падкрэсліў, што першасная задача сацыёлага – звярнуць увагу на праблему і знайсці новую ідэю. Пры гэтым зацікавіць тых, хто зможа вырашыць справу.

Таццяна МОРАВА

ВЫСТАВЫ

Першая школа выкладання рускай мовы як замежнай

На ФДА адкрылася выстава навучальна-метадычнай літаратуры, падрыхтаванай супрацоўнікамі кафедры рускай мовы як замежнай і агульнаадукацыйных дысцыплін за 55 гадоў дзейнасці.

Ганаровымі гасцямі мерапрыемства сталі заслужаныя асобы – Т. П. Плешчанка, З. Я. Какошнікава, Т. Л. Пятровіч, А. У. Самаль, Р. І. Кавалёва, В. К. Васілеўская, а таксама дырэктар фундаментальнай бібліятэкі БДУ У. Г. Кулажанка з калегамі.

Ва ўнікальнай экспазіцыі прадстаўлены рарытэтныя матэрыялы, якія захаваліся ў адзіным экзэмпляры, перададзеныя ветэранамі і супрацоўнікамі кафедры з асабістых архіваў. З вялікай цікавасцю госці выставы азнаёміліся з літаратурай па агульнаадукацыйных дысцыплінах, якія вывучаюцца замежнымі слухачамі, – біялогіі, геаграфіі, гісторыі Беларусі, матэматыцы, грамадазнаўстве, рускай літаратуры, фізіцы, хіміі, эканоміцы і інш. Сапраўднай знаходкай сталі матэрыялы, выдадзеныя ва ўніверсітэтах розных краін свету, дзе працавалі выкладчыкі кафедры.

Значная частка калекцыі прадстаўлена навучальнымі дапаможнікамі новага пакалення, якім прысвоены грыф ВМА. Гонарам кафедры стала ўзнагарода БДУ за кнігу «Руская мова як замежная (базавы ўзровень)», прысвоеная аўтарскаму калектыву на міжнародным галіновым конкурсе «Універсітэцкая кніга: сацыяльна-гуманітарныя навукі–2014» (г. Казань, Расія) у намінацыі «Найлепшае навучальнае выданне па мовазнаўстве і літаратуразнаўстве».

На сустрэчы ветэраны падзяліліся сваімі ўспамінамі пра станаўленне школы выкладання рускай мовы як замежнай у краіне. Госці з радасцю адзначылі, што менавіта БДУ быў у авангардзе распрацоўкі гэтага новага кірунку. Дзякуючы невычэрпнай энергіі і кампетэнтнасці першых беларускіх выкладчыкаў – супрацоўнікаў БДУ – сфарміравана значная метадычная база, на аснове якой працягваюцца традыцыі выкладання рускай мовы як замежнай у Беларусі.

Выстава адкрывае цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 55-гадовага юбілею факультэта даўніверсітэцкай адукацыі.

Т. М. КУЗЬМІНАВА, К. П. ЛЮБЕЦКАЯ

ЮБІЛЯРЫ

05 снежня Верхаводка Ігар Іванавіч, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права

10 снежня Дзянісаў Андрэй Анатольевіч, загадчык НДЛ клетачнай інжынерыі і нанабіятэхналогій

17 снежня Габасаў Рафаіл, прафесар кафедры метадаў аптымальнага кіравання

18 снежня Чэчат Раіса Рыгораўна, дацэнт кафедры рускай мовы

31 снежня Печанёва Таццяна Анатольеўна, прафесар кафедры культуралогіі

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інтэлектуальных сістэм, вышэйшай матэматыкі, біяхіміі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі, паліталогіі, экалогіі чалавека,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай хіміі, высокамалекулярных злучэнняў, тэорыі літаратуры, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, тэорыі і метадалогіі журналістыкі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяхіміі, батанікі, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, аналітычнай хіміі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, лазернай фізікі і спектраскапіі, агульнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, вышэйшай матэматыкі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, вышэйшай алгебры і аховы інфармацыі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, геаграфічнай экалогіі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, гісторыі беларускай мовы, беларускай літаратуры і культуры, замежнай літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, старажытнага часу і сярэдніх вякоў, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў, эканамічнай інфарматыкі, міжнароднага права, экалогіі чалавека, тэлебачання і радыёвяшчання, тэхналогій камунікацыі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, геадэзіі і картаграфіі, гісторыі беларускай мовы, крыніцазнаўства, эканамічнай інфарматыкі, крыміналістыкі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, дызайну,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага менеджменту, тэорыі і практыкі перакладу.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ «РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ» БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ псіхалогіі і педагагічнага майстэрства;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ моладзевай палітыкі і сацыякультурных камунікацый;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры кіравання і эканомікі вышэйшай школы.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 120, тэл. 200 91 07.

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ сацыяльнай работы і рэабіліталогіі;

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ мастацтваў.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.

СПАРТПЛЯЦОЎКА

ДАЦЯГНУЦЦА ДА ЗОРАК

Жаночая зборная БДУ па футзале – ЧЭМПІЁН!

Абгуляўшы ў фінальным матчы каманду Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта з лікам 2–0, чэмпіёнкай Рэспубліканскай універсіяды–2015 па футзале сярод жаночых каманд стала зборная БДУ.

З чэмпіёнскім кубкам капітан зборнай БДУ Вікторыя Бундзюкова

У фінальным матчы фаварыткамі лічыліся гродзенкі: дзяўчаты з'яўляюцца чэмпіёнкамі леташняга турніру, а таксама выдатна выявілі сябе на працягу ўсёй Універсіяды–2015. Аднак спартсменкі з БДУ верылі ў свае сілы.

Абедзве каманды паказалі, што дзяўчаты таксама могуць выдатна абыходзіцца з мячом, часцяком уступаючы ў жорсткія стыкі.

У гульні каманды БДУ адчувалася пісьменная трэнерская ўстаноўка. Супраць прафесійных суперніц дзяўчаты гулялі другім нумарам, надзейна абараняючыся і балюча кусаючы суперніц на контратаках. Ужо ў першым тайме дзве з такіх завяршыліся ўзяццем варот каманды ГрДУ.

Гродзенкі з усіх сіл спрабавалі выправіць сітуацыю ў другой палове сустрэчы, аднак наперадзе ў іх атрымлівалася далёка не ўсё задуманае. Забіць ім так і не ўдалося.

Такім чынам, упершыню ў гісторыі турніру каманда БДУ падняслася на найвышэйшую прыступку пастамента! Віншуем дзяўчат і жадаем мноства перамог у далейшым!

Трэніраваў каманду БДУ старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Віталь Валасюк.

У матчы за «бронзу» футзалісткі БДУФК абгулялі зборную МагДУ з лікам 4–1.

Па выніках турніру найлепшым форвардам абвешчана Ганна Марозава (БДУ).

Нагадаем, што нашы спартсменкі ў групавой стадыі абыгралі каманду БДАТУ з лікам 11-1, перамаглі БДТУ 11-3 і згулялі ўнічыю з ГомДУ 1-1. У паўфінале нашы дзяўчаты былі мацнейшыя за БДУФК: 3-2.

Склад каманды: Ярадангуліева Ксенія (ІЖ, 2 к.), Нікітушкіна Аляксандра (ММФ, 2 к.), Ляўковіч Аліна-Марыя (ММФ, 4 к.), Мейсак Дар'я (фізфак, 5 к.), Марозава Ганна (ДІКСТ, 2 к.), Бундзюкова Вікторыя (фізфак 3 к.), Волкава Дар'я (юрфак, 2 к.), Лепяшко Ксенія (ФФСН, 2 к.), Харытонава Вераніка (ММФ, 3 к.), Ігнацюк Вольга (эканамфак, 3 к.), Тэрліжэнка Ірына (ФПМІ, 3 к.), Валяева Дар'я (юрфак, 1 к.).

Анастасія ПЯЦЬКО

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Яшчэ фота і відэа gazeta.bsu.by

Растопім лёд разам!

На дзень студэнта пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ зладзіла акцыю «Растопім лёд разам!».

17 лістапада «пярвічка» сабрала студэнтаў, працаўнікоў і кіраўніцтва БДУ ў СДЮШАР па фігурным катанні.

Усё дзеянне разгортвалася на лядовай арэне. Спачатку студэнтаў павіншавалі рэктар БДУ Сяргей Абламейка, старшыня прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр Бойка і старшыня студэнцкага прафкама Вольга Локцева. Найлепшых лідараў яны ўзнагародзілі граматамі і падарункамі.

Пасля запрошаныя таксама сталі на канькі і далучыліся да пярэстага натоўпу студэнтаў на лёдзе.

Фіналісты фэсту эстрады БДУ сваімі выступленнямі традыцыйна зарадзілі публіку выдатным настроем. Акрамя таго, можна было праверыць удачу і выйграць прызы ад прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ і партнёра мерапрыемства кампаніі Daroo. Пацешылі і вясёлыя міньёны на каньках.

Са сцэны на мове сваёй краіны гасцей павіншавалі студэнт юрфака Уладзіслаў Пучкоўскі (Беларусь), студэнтка ФМА Ніша (Мазамбік), аспірантка Інстытута журналістыкі Чжань Хаянь (КНР).

Здзівілі публіку зачаравальныя выступленні прафесійных фігурыстаў – майстроў спорту і членаў нацыянальнай зборнай Таццяны Данілавай і Мікалая Каменчука, Андрэя Міхальчука, Дар'і Батуры.

Адмысловымі гасцямі свята сталі хакеісты «Дынама-Мінск» Аляксандр Мацярухін, Дзмітрый Мялешка, Дзмітрый Буйніцкі і Яўген Лісавец, якія павіншавалі студэнтаў з іх прафесійным святам, пакінулі аўтографы і правялі майстар-клас для ўсіх ахвотнікаў. Яшчэ адным падарункам для студэнтаў стала выступленне Сашы Нема, як заўсёды, пазітыўнае і энергічнае.

Наперадзе студэнтаў чакаюць «суровыя» ўніверсітэцкія будні – пары, залікі і іспыты. Але галоўнае, як заўважыла Вольга Локцева, пасапраўднаму пражыць студэнцкія гады: сабраць усе ўражанні і выкарыстоўваць усе магчымасці.

Надзея КРАЎЧУК

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

«Ты не разумееш чаго-небудзь сам, калі не можаш растлумачыць гэта сваёй бабулі»
(А. Эйнштэйн)

Проста пра складанае

25 лістапада адбылася чарговая студэнцкая канферэнцыя ў межах праекта «Навука на пальцах», на якую прыйшла моладзь, неабыякавая да новых ведаў. Сем студэнтаў агучылі свае даклады, адзін з якіх быў прызнаны найлепшым. Тэмы былі самыя розныя – ад паняцця метэорнага патоку да антычнай міфалогіі.

Студэнт гістфака ***Ігар Дубанос*** у дакладзе «Дзяржава і эканоміка: як інтэрвенцыяналізм забівае дзелавую актыўнасць» разгледзеў тонкасці функцыянавання прыватнага і дзяржаўнага бізнесу.

Анастасія Таболіч, студэнтка фізфака БДУ, прадставіла адразу два даклады, прычым абсалютна з розных навуковых галін. У першым («Даследаванне наяўнасці метэорнага патоку ад кометы ISON») адзначыла, што паміж фотаназіраннем і здымкамі плоскай камерай амаль няма ніякай розніцы. Другі даклад «Асноўныя тэндэнцыі развіцця выяўленчага мастацтва ў Беларусі ў 1920–1930 гады» акунуў слухачоў у гісторыю беларускага жывапісу. Былі прыведзены існуючыя на той момант у Беларусі творчыя аб'яднанні, шырока прадстаўлена тэматычная палітра таго часу. Анастасія прыкмеціла, што найбольшым вынаходніцкім патэнцыялам вылучаўся Віцебск.

Анастасія Раманоўская з БДТУ агучыла цікавую тэму «Паняцце крытыкі і крытыканства. Уплыў сацыяльных сетак на самаацэнку». У свой час даклад заняў другое месца на конкурсе студэнцкіх прац БДЭУ. Анастасія на простых прыкладах патлумачыла, як адрозніць канструктыўную крытыку ад крытыканства (тролінгу). Крытыкан адразу накідваецца з катэгарычнымі нараканнямі, не пакідаючы аб'екту крытыкі шансу на рэабілітацыю. Крытык павінен разбірацца ў прадмеце аналізу, а не проста распыляцца ў негатыўных заўвагах. Анастасія таксама распавяла пра ролю інтэрнэту ў нашым жыцці. Паводле анкетавання, амаль 70% людзей штодня праводзяць у інтэрнэце 5–6 гадзін («Фэйсбук», «УКантакце», «Ютуб» і г. д.).

– Мы жывём у эпоху, калі тэхнічны збой «УКантакце» прычыняе людзям большы дыскамфорт, чым адключэнне вады. І гэта ненармальна, – падкрэслівае ў сваім дакладзе Анастасія.

А пакуль слухачы прыкідвалі, колькі часу ў іх займае інтэрнэт, свае ўменні прадэманстравалі ***студэнты хімічнага факультэта.*** З дапамогай разнастайных колбачак, парашкоў і раствораў яны выраблялі ўсім вядомы напітак «Дзюшэс», запалкі, зубную пасту для слана, флюарэсцэнцыю, якая пад уздзеяннем ультрафіялету давала зеленаватае святло (у дзень святога Патрыка рэкі Чыкага шчодра аздабляюцца такім растворам).

Студэнт-фізік ***Павел Лабацэвіч*** расказаў пра ролю лазераў у медыцыне. Слухачы даведаліся, што такое тэрапеўтычнае акно (участкі, найбольш успрымальныя да ўздзеяння лазера), якія лазеры выкарыстоўваюцца ў касметалогіі, што такое хвалявод (прыбор, які дазваляе перадаваць выпраменьванне лазера без хірургічных разрэзаў), і шмат чаго іншага. «Наша краіна з'яўляецца лідарам па выкарыстоўванні лазераў у медыцыне, якія актыўна ўжываюцца ў лячэнні анкалагічных захворванняў», – рэзюмаваў Павел.

Андрэй Налічаеў і Кірыл Дашкевіч з мехмата БДУ распавялі пра электрамагнітную індукцыю. ***Кацярына Касьян*** паспрабавала суаднесці знакі задыяка з антычнай міфалогіяй. Атрымалася цікава. Пераможцам праекта стаў хімік ***Іван Рэзнікаў*** з праектам «Лігнін: пастка для нафты і прыбытковы падыход»:

– Раней ездзіў і рабіў даклады на канферэнцыях – у асноўным для вузкага кола людзей з ужываннем навуковай тэрміналогіі, каб здавацца разумнейшым. А падзяліцца-та вынікамі хочацца з усімі. Дадзены вопыт дазваляе разгледзець свой даклад і працу ў цэлым з іншых пунктаў гледжання. Як вядома, калі некалькі сляпых людзей будуць навобмацак апісваць слана, то ў кожнага ён выйдзе сваім: слуп, змяя, вяроўка, сцяна, палатно, піка...

Мае навуковыя кіраўнікі прафесары Т. А. Савіцкая і Д. Д. Грыншпан заўсёды прымушаюць не проста разумець, а асэнсоўваць сваю навуковую працу. Гэта вялікі плюс, у якога ёсць адваротны бок: калі распавядаў блізкім раней нешта са свету навукі – усім усё здавалася жудасна складаным і мной захапляліся, але калі паспрабаваў дэталёва «разжаваць», то адразу ж згубіўся «налёт загадкавасці».

Завяршылася сустрэча цікавымі хімічнымі вопытамі і гатаваннем сапраўднага марозіва.

Алена ЯКАВЕНКА

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

1 снежня 2015 года
Падпісана да друку 30.11.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by